# ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВЫЯ РЭФОРМЫ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТАГОДДЗЯ

Бічун В.М., *аспірант кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У 1764 г. пасля смерці караля Аўгуста III быў пакладзены пачатак рэфармаванню грамадска-палітычнага ладу ў Рэчы Паспалітай. Канвакацыйны сойм прыняў шэраг пастаноў, якімі ўносіліся змены ў дзейнасць Вальнага сойма. Так, дэпутаты ад паветаў вызваляліся ад абавязку прытрымлівацца атрыманых на павятовых сойміках інструкцый, якімі абмяжоўвалася ўжыванне дэпутатамі права вета па эканамічных пытаннях.

У верасні 1764 г. каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. У гэты перыяд у палітычным жыцці дзяржавы праявілася рэзкае сутыкненне дзвюх процілеглых пазіцый: неабходнасць неадкладных і кардынальных рэформаў і, наадварот, патрэба ў захаванні папярэдняга, кансерватыўнага развіцця дзяржавы. Гэта выявілася ў вострым супрацьстаянні асобных грамадскіх груп – рэфарматараў і кансерватараў.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі меў уласную праграму адраджэння Рэчы Паспалітай з заняпаду, і, насуперак намеру Кацярыны II, набыцця незалежнасці ад замежных дзяржаў. У аснове яго амбіцыйных планаў знаходзіліся асвета народа, правядзенне разнастайных рэформаў, змены адносін з Расійскай імперыяй з васальных на партнёрскія. Дасягненню гэтых мэт павінны былі служыць у роўнай ступені як літаратура, мастацтва, пашырэнне ідэі Асветы, навучанне, разгорнутая прапаганда, так і стварэнне асноў каралеўскай улады дзякуючы перабудове двара, уласнай каралеўскай канцылярыі (кабінета), адраджэнні няіснай дыпламатычнай службы, развіццё эканомікі і аднаўленне арміі [1, с. 78].

Адной з найбольш вострых праблем Рэчы Паспалітай па-ранейшаму заставалася “дысідэнцкая” (ураўноўванне ў правах з каталікамі так званых дысідэнтаў – праваслаўных, пратэстантаў і інш.). Варта адзначыць расійска-прускую дамову 1764 г. аб захаванні з дапамогай ваеннай сілы таго парадку, які склаўся ў Рэчы Паспалітай, і недапушчэнні рэфармавання дзяржаўнага ладу [2, с.123].

Buketov University

У 1767 г. пад патранажам Расіі і Прусіі была абвешчана праваслаўная канфедэрацыя ў Слуцку, а ў Торуні – пратэстанцкая канфедэрацыя. У сувязі з тым, што на працягу першай паловы XVIII ст. шэрагам соймавых пастаноў абмяжоўваліся палітычныя правы праваслаўных і пратэстантаў, гэтыя канфедэрацыі ставілі мэтай наданне роўнасці ў правах розным рэлігійным канфесіям у Рэчы Паспалітай, а таксама адмену ўсіх дыскрымінацыйных нормаў у дачыненні праваслаўных і пратэстантаў. Насуперак гэтым канфедэрацыям у Радаме ў той жа час была абвешчана канфедэрацыя каталікоў з мэтай недапушчэння правядзення такіх рэформаў.

У 1768 г. на сойме было падрыхтавана рашэнне аб ураўноўванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі. Апроч таго, былі прыняты “Кардынальныя правы” – закон, якім рэгламентавалася нязменнасць і непарушнасць феадальнага ладу Рэчы Паспалітай. Яны былі своеасаблівай рэакцыяй на падпісаны ў 1768 г. дагавор паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй аб ураўнанні ў правах некаталікоў хрысціян з каталікамі. Першы артыкул Кардынальных правоў зацвярджаў правіла, што законы ў Рэчы Паспалітай могуць прымацца толькі сумесна трыма станамі (саслоўямі): каралём, сенатам і дэпутатамі ад шляхты. На самой жа справе ўсе яны прадстаўлялі толькі адно саслоўе шляхты, а больш дакладна, толькі адзін клас – феадалаў-землеўласнікаў.

Наступныя артыкулы замацоўвалі нормы, якія забяспечвалі выбарнасць караля, недапушчальнасць наследавання каралеўскага трона (арт.3); непарушнасць правоў шляхты (арт. 4); а таксама захаванне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у вечнай уніі з Польшчай (арт. 6). Права “luberum veto” на вальных соймах захоўвалася назаўсёды (арт. 8). Больш поўна і катэгарычна пацвярджалася права шляхты на феадальныя ўладанні, на зямельныя маёнткі разам з залежнымі сялянамі (арт. 9). Наступным артыкулам уводзіўся ў дзеянне на тэрыторыі Польшчы артыкул першы раздзела 12 Статута ВКЛ 1588 г. аб крымінальнай адказнасці пад пагрозай смяротнага пакарання шляхціца за наўмыснае забойства простага чалавека. Кардынальныя правы захавалі норму Генрыкаўскіх артыкулаў аб праве шляхты адмовіць каралю ў падпарадкаванні пры парушэнні ім Кардынальных правоў [3, с.124-125].

У 1768 годзе прыхільнікі “залатой” шляхецкай вольнасці арганізавалі ў г. Бары канфедэрацыю, якая аб’яднала даволі шырокія колы шляхціцаў-каталікоў і заклікала іх да барацьбы за адмену



Buketov university

раўнапраўя з праваслаўнымі і пратэстантамі. Барскіх канфедэратаў падтрымала Турцыя, якая пачала вайну з Расіяй. Скарыстаўшы момант, Аўстрыя ў 1769-1770 гг. акупіравала частку Польшчы і Украіны, а Прусія – паўночна-заходнюю частку Польшчы і прапанавала Расіі заключыць дагавор аб сумесным падзеле Рэчы Паспалітай. Пры першым падзеле да Расіі адышла Усходняя Беларусь [4, с.132].

У 1773 г. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай быў падпісаны трактат “Пра аднаўленне міру паміж абедзвюма дзяржавамі”. У асобным акце, прынятым 15 (26) сакавіка 1775 г., Расія гарантавала Рэчы Паспалітай захаванне Кардынальных правоў. У 70-я гг. XVIII ст. у Рэчы Паспалітай былі распачаты больш актыўныя спробы дзяржаўнага рэфармавання.

У 1775 годзе ў якасці цэнтральнага ўрада была створана Пастаянная Рада, якая абіралася соймам. Пастаянная Рада складалася з караля як старшыні, 18 сенатараў, 18 дэпутатаў сойма ад шляхты (9 з Польшчы і 9 з ВКЛ), якія павінны былі змяняцца на 1/3 частку кожныя два гады. Яна падзялялася на 5 дэпартаментаў (з міністрамі на чале): замежных спраў, войска, паліцыі, скарбу (юстыцыі) і справядлівасці. Кіраваў справамі Рады маршалак, які выбіраўся са шляхецкіх дэпутатаў.

Да кампетэнцыі Пастаяннай Рады быў аднесены шэраг функцый, якія належалі раней каралю. З утварэннем Рады кароль быў пазбаўлены права прызначэння сенатараў і некаторых іншых службовых асоб, надаваць афіцэрскія званні, распараджацца дзяржаўнымі маёнткамі. Ён павінен быў падпарадкоўвацца рашэнням Рады. Пастаянная Рада атрымала права склікаць звычайныя і надзвычайныя соймы нават без згоды караля, кантраляваць дзяржаўны скарб без справаздачы перад соймам.

У сувязі з тым, што ў радзе пераважалі прадстаўнікі рэакцыйных колаў, залежныя ў значнай ступені ад суседніх дзяржаў, то ў грамадскай свядомасці прагрэсіўных колаў, яе пачалі называць “Рада здрада”. Таму, калі пачаў працаваць Чатырохгадовы сойм, у 1789 г. Пастаянная Рада была ліквідавана. Адноўлена яна Гродзенскім соймам 1793 года.

Самыя важныя палітычныя рэформы ў дзяржаве адбыліся на так званым Чатырохгадовым сойме (1788-1792) – заканадаўчым органе Рэчы Паспалітай, што зрабіў спробу рэфармаваць грамадска-палітычны лад дзяржавы. Скліканы ў 1788 г. сойм абвясціў сябе

канфедэрацыяй, што адмяняла дзеянне прынцыпа ліберум вета, а таму соймавыя рашэнні прымаліся простай большасцю галасоў.

У верасні 1789 г. сойм стварыў канстытуцыйную камісію пад кіраўніцтвам А. Красінскага, якая прапанавала замяніць “кардынальныя правы” нормамі аб суверэнітэце і непадзельнасці тэрыторыі дзяржавы, пазбавіць немаёмную шляхту выбарчых правоў, забараніць ліберум вета, канфедэрацыі, дэпутацкія наказы (інструкцыі соймікаў). Канстытуцыйная камісія прапанавала таксама ўвесці спадчыннасць каралеўскага трона.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Францыі аказалі значны ўплыў на дзейнасць сойма Рэчы Паспалітай. У студзені 1791 г. сойм прымае Кардынальныя непарушныя правы, якія адмянілі папярэдні аднайменны закон 1768 г. і замацавалі новыя прынцыпы канстытуцыйнага ладу дзяржавы. Адпаведна гэтаму закону Рэч Паспалітая абʼяўлялася прававой дзяржавай, у якой вяршэнства належыла закону, прынятаму соймам. Гаварылася аб вечнай уніі Польшчы і ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (арт. 5). Такім чынам, закон па сутнасці замацоўваў федэратыўнае ўладкаванне дзяржавы.

Характэрна, што ў гэтым акце, у адрозненне ад папярэдніх кардынальных правоў, не было нормаў, якія замацоўвалі феадальны грамадскі лад. Сцвярджалася, што каралём Польшчы і Вялікім князем Літоўскім можа быць толькі католік (арт.2), а святая каталіцкая рымская вера абодвух абрадаў, гэта значыць як рымская, так і грэка-каталіцкая (уніяцкая) застаецца пануючай у дзяржаве (арт.1). Разам з тым, іншым веравызнанням гарантавалася свабода выканання іх абрадаў і культаў (арт. 4). Пераход з каталіцкай веры ў якую-небудзь іншую лічыўся крымінальным злачынствам (арт.3).

Новым быў артыкул, які абвяшчаў і забяспечваў свабоду слова і друку кожнаму грамадзяніну (арт. 11). Недапушчалася толькі наўмыснае прызванне да бунту супраць дзяржавы, праступкаў супраць маралі і каталіцкай веры, дзеля чаго захоўвалася царкоўная цэнзура. Адзначалася, што ніхто не павінен карыстацца юрыдычнай недатыкальнасцю, а таксама ніхто не павінен гэтага права парушаць, апроч спецыяльна прадугледжаных правам выпадкаў (арт. 10) [3, с.129].

У сакавіку 1791 г. быў прыняты Закон аб павятовых сойміках, які Канстытуцыя 1791 г. абвясціла як “как наиглавнейший закон о гражданских свободах и вольностях”.

Ён вызначаў арганізацыю соймікаў, парадак іх пасяджэнняў і працэдуру прыняцця рашэнняў. У дадзеным законе таксама ўтрымвалася важная інфармацыя, якая тычылася структуры шляхецкага становішча і аб'ёму палітычных правоў шляхты.

У адпаведнасці з дадзеным законам беззямельная шляхта (“галота”) пазбаўлялася права ўдзельнічаць у працы соймікаў і абіраць дэпутатаў на агульнадзяржаўны сойм.

Выбарчым правам магла валодаць толькі аселая шляхта не маладзей 24 гадоў. Таксама пасля прыняцця дадзенага закона быў зменены спосаб атрымання і ўспадкоўвання шляхецкага статусу і доступу да ўлады, які раней быў даступны толькі народжаным у шляхецкай сям'і, пра што гаварылася і ў Канстытуцыі 3 мая.

У красавіку 1791 г. прымаецца Закон ”Гарады нашыя каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай” (Закон аб гарадах), які значна пашырыў правы гарадскога насельніцтва.

Згодна закону каралеўскія гарады абвяшчаліся вольнымі. Усе абывацелі гарадоў, якія займаліся гандлем, абавязаны былі прыняць гарадское права шляхам прынясення прысягі каралю Рэчы Паспалітай і ўпісання ў гарадскія кнігі. Гарады па-ранейшаму маглі выбіраць магістраты і карыстацца адпаведнымі вольнасцямі, аднак забаранялася сумяшчэнне гарадскіх пасад з земскімі і вайсковымі.

Мяшчанам гарантавалася права на асабістую недатыкальнасць, якім адпаведна ранейшым законам дзяржавы валодала толькі шляхта. Акрамя таго, мяшчане атрымалі права набываць маёнткі з залежнымі сялянамі, займаць нязначныя пасады ў дзяржаўных установах і судах, быць адвакатамі, прадстаўляць свае інтарэсы ў соймавых камісіях пры разглядзе пытанняў, якія тычыліся гарадоў.

Тыя мяшчане, што валодалі маёнткамі альбо выслужылі ў войску афіцэрскія званні, атрымоўвалі права на шляхецкае званне. Шляхцічамі маглі станавіцца і мяшчане, якія валодалі пэўнай нерухомасцю ў гарадах. У шляхецкія званні ўводзіў спецыяльнай пастановай сойм.

Ствараліся ўмовы для службы мяшчан у дзяржаўных установах і войску. Пад юрысдыкцыю магістратаў траплялі ўсе гараджане. Закон уводзіў гарадскія апеляцыйныя суды, якія выбіраліся ў складзе 5 чалавек на два гады. Такія суды былі створаны ў Пінску, Вільні, Гродне, Навагародку, Брэсце.

Жыхары вольных і апеляцыйных гарадоў маглі пасылаць сваіх прадстаўнікоў на сойм, дзе яны мелі права рашаючага голасу па



Buketov university

справах, якія тычыліся гарадоў і гандлю, а таксама дарадчага голасу па іншых справах.

Закон аб гарадах ствараў спрыяльныя ўмовы для развіцця гарадоў і збліжэння мяшчан са шляхтай, што дазваляла ўмацаваць палітычныя правы шляхецка-буржуазнага блока і яшчэ больш энергічна праводзіць дзяржаўныя рэформы.

Новым важным органам, уведзеным Законам аб гарадах, з'явілася менавіта Камісія паліцыі, якая галоўным чынам ажыццяўляла нагляд за гарадамі. Таксама Камісія займалася пытаннямі бяспекі гандлю, аховы здароўя, прыстойнасці нораваў, апекі над убогімі і інш. Камісія паліцыі падзяляла Рэч Паспалітую на 26 акруг, у якіх пэўныя групы гарадоў падпарадкоўваліся прызначаным ёю інтэндантам.

Дзейнасць камісіі была даволі прадуктыўнай. Так, на працягу першага года існавання ёю было разгледжана больш за 25 тыс. дакументаў, якія паступілі ад розных гарадоў.

У 1791-1792 гг. на падставе Закона аб гарадах 1791 г. выдаваліся ад імя Станіслава Аўгуста так званыя рэнацыйныя прывілеі (напрыклад, у 1792 г. – Радашковічам, Слоніму, Ліпнішкам, Ашмянам, Браслаunion, Барысаву і г.д.). Яны мелі за мэту аднавіць дзеянне ранейшых гарадскіх грамат на магдэбургскае права і ўтрымлівалі амаль аднолькавы змест. Гарадам надаваўся ўласны герб.

Дамы і землі мяшчан абвяшчаліся іх дзедзічнай уласнасцю. Усе жыхары горада падлягалі ўладзе гарадскога магістрата і павінны былі плаціць падаткі. Гараджане павінны былі кіравацца Канстытуцыяй і магдэбургскім правам.

Закон аб гарадах стварыў дадатковыя ўмовы для эканамічнага і палітычнага развіцця гарадоў, збліжэння правоў мяшчан і шляхты, а таксама ў пэўнай ступені для больш значнай кансалідацыі ўсяго грамадства. Гэты закон быў уключаны потым у Канстытуцыю 1791 г.

Такім чынам, у перыяд са студзеня па красавік 1791 г. у выніку плённай заканадаўчай дзейнасці сойма быў прыняты шэраг законаў, якія ўвайшлі ў якасці складанай часткі ў Канстытуцыю 3 мая 1791 г.

Актыўная заканадаўчая дзейнасць сойма прывяла да значных змяненняў у канстытуцыйным заканадаўстве Рэчы Паспалітай і падрыхтавала спрыяльную ўнутрыпалітычную глебу для прыняцця прагрэсіўнай Канстытуцыі.

Buketov university

Спіс літаратуры:

1.Łojek J. Stanisław August Poniatowski i jego czasy. – W.: Alfa – Wero, 1998. – S. 78.

2.ДоўнарТ.І. ГісторыядзяржавыіправаБеларусі. – М.: Амалфея, 2008. – С. 123.

3.ВасілевічР.А., ДоўнарТ.І., ЮхоІ.А. Гісторыяканстытуцыйнага права Беларусі. – М.: ВТАА “Праваіэканоміка”, 2001. – С. 124-129.

4.ВішнеўскіА.Ф. ГісторыядзяржавыіправаБеларусі. – М.: Экаперспектыва, 2000. – С. 132.

## ПРОБЛЕМЫ ОПРЕДЕЛЕНИЯ ПРАВОВОЙ ПРИРОДЫ КРАУДФАНДИНГА

Вакула А.А., *аспирант кафедры финансового права и правового регулирования хозяйственной деятельности БГУ, г. Минск. Республика Беларусь.*

В настоящее время краудфандинг становится важнейшей технологией привлечения денежных средств или иных ресурсов для финансирования разнообразных проектов [1, с. 171]. Одно из основных и главных преимуществ краудфандинга – это привлечение в основном финансовых ресурсов граждан, которые в целом создают значительные суммы денежных средств для инвестиций различных проектов [2, с. 142]. Краудфандинг – это в первую очередь деятельность, осуществляемая посредством глобальной компьютерной сети Интернет. В связи с все большим внедрением хозяйственной деятельности в интернет-пространство точная правовая регламентация данных отношений, а также четкое определение правовой природы краудфандинга и ее легальное закрепление будет содействовать развитию бизнеса и перспективных отраслей экономики государства и положительно отразиться на инвестиционном климате и инвестиционной привлекательности Республики Беларусь [3, с. 274].

Краудфандинг отличается простотой и массовой доступностью для граждан. Добиться реализации могут проекты всех видов и направлений деятельности, в том числе и в социальной сфере. Для начинающих предпринимателей сегодня все труднее находить инвесторов. Инвесторы не хотят рисковать и редко вкладываются в

Buketov university